АПО

ШТОМЕСЯЧНЫ
НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНЫ
ЧАСОПІС

# НАРОДНАЯ Асвета

**СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ**
ПСІХАЛАГІЧНАЕ СУПРАВАДЖЭННЕ СІСТЭМЫ АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСІ

**АДМІНІСТРАЦЫЙНЫ ПАРТФЕЛЬ**
ПЕДАГАГІЧНЫ САВЕТ: МЕТОДЫКА АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕННЯ

**ПЕДАГАГІЧНАЯ АСАМБЛЕЯ**
ГРАМАДЗЯНСКАЕ І ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ШКОЛЬНІКАЎ

**ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ «ШКОЛЫ БЕЛАРУСІ»**
СЕМІНАР-ПРАКТЫКУМ «МЕТАДЫЧНЫ ІНСТРУМЕНТАРЫЙ СТРАТЭГІІ АКТЫЎНАЙ АЦЭНКІ»

**БАЦЬКОЎСКІ СХОД**
ПРАФЕСІЙНАЕ САМАВЫЗНАЧЭННЕ ПАДЛЕТКАЎ

1
2022

# ДЗІЦЯЧА-БАЦЬКОЎСКІ СХОД «ТВОЙ ПОСПЕХ – ТВАЕ НАМАГАННІ»

## Далучэнне бацькоў да прафарыентацыйнай работы з падлеткамі



**А. А. Фадзеева,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
СШ № 1 г. Пінска

**Жаданне бацькоў бачыць сваіх сыноў і дачок паспяховымі, так бы сказаць, на годнай прыступцы грамадскай лесвіцы – цалкам натуральнае і зразумелае. Але з якіх «інгрыдыентаў» складаецца жыццёвы поспех? Якія крокі трэба рабіць, каб дасягнуць яго? Практыка паказвае, што далёка не ўсе таты і мамы здольныя матываваць сваіх дзяцей на пошук адказаў на гэтыя лёсавызначальныя пытанні. Даць кампетэнтныя, пераканаўчыя парады бацькам і вучням можа класны кіраўнік, які творча ставіцца да прафарыентацыйнай работы.**

Прапануем вашай увазе **дзіцяча-бацькоўскі сход «Твой поспех – тваё намаганні» для вучняў 8–9 класаў.**

**Мэты:** павышэнне ўзроўню псіхалагічнай кампетэнцыі навучэнцаў і бацькоў у галіне прафесійнага самавызначэння асобы; абуджэнне ў падлеткаў патрэбнасці ў самаўдасканаленні.

**Падрыхтоўчая работа:** анкетаванне групай «псіхолагаў» з ліку вучняў сваіх аднакласнікаў па пытаннях выбару будучай прафесіі, збор групай «карэспандэнтаў» інфармацыі аб «незвычайных» прафесіях; афармленне прэзентацыі «Шлях да поспеху».

**Ход мерапрыемства**

**І. Уводная частка**

❑ **Практыкаванне «Асацыяцыі»**

*Вядучы (класны кіраўнік) прапануе ўдзельнікам прывесці асацыяцыі да слова «паспяховы».*

*Удзельнікі выказваюць свае меркаванні.*

**Вядучы.** Такім чынам, абагулім: паспяховымі мы называем людзей, якія дасягаюць сваіх мэт. І падчас нашай сустрэчы мы паспрабуем адшукаць шляхі, якія могуць да гэтага прывесці.

**ІІ. Асноўны этап**

**Вядучы.** Поспех – увогуле дастаткова няпэўнае паняцце, бо кожны чалавек вызначае яго для сябе па-свойму. Для аднаго стаць паспяховым – значыць кіраваць вялікай кампаніяй, для другога – зарабляць шмат грошай, для трэцяга – займацца цікавай справай, для чацвёртага – стварыць дружную сям'ю. Рыхтуючы сённяшнюю сустрэчу, мы даручылі групе «псіхолагаў» з ліку вучняў нашага класа правесці апытанне сярод сваіх аднакласнікаў. І вось што высветлілася.

❑ **Паведамленне па выніках анкетавання «Мая прафесія»**

Прадстаўнік групы «псіхолагаў» паведамляе ўдзельнікам, якія складнікі апытаныя лічаць неабходнымі для дасягнення поспеху. Гэта розум, упартасць, прагнасць, захопленасць, уменне валодаць сабой, стойкасць, сіла волі, засяроджанасць, самадысцыпліна, сталасць, прадпрымальнасць, адзінства мэтаў і дзеянняў, працавітасць, смеласць. Найбольш запатрабаванымі сёння, паводле меркавання рэспандэнтаў, з'яўляюцца наступныя прафесіі: інжынер, урач, юрыст, праграміст, настаўнік, эканаміст, фатограф, візажыст, мікрабіёлаг, тэхнолаг, энергетык, будаўнік, IT-тэхнолаг.

Больш за ўсё школьнікаў у абранай прафесіі прыцягваюць такія характарыстыкі, як заработная плата, стабільнасць, прэстыжнасць, умовы для паўнацэнных зносін, творчасці, самаразвіцця, пашырэння кругагляду, магчымасць кар'ернага росту, дапамогі людзям, наладжванне канструктыўных сувязей.

Таксама вучні і іх бацькі знаёміліся з вынікамі анкетавання ў працэнтным выражэнні.

1. Ці вызначыліся вы з выбарам сваёй будучай прафесіі?

Так – 46%; не – 54%.

2. Ці трэба, на ваш погляд, улічваць меркаванне бацькоў, іншых людзей пры выбары прафесіі?

Так – 92%; не – 8%.

3. Які крытэрый з'яўляецца для вас найбольш важным пры выбары прафесіі?

а) высокая заработная плата – 31%;

б) цікавая праца – 61%;

в) прэстыжнасць – 8%;

г) свой варыянт – 0%.

4. Які тып прафесіі вы лічыце сваім?

а) «Чалавек – прырода» – 3%;

б) «Чалавек – тэхніка» – 12%;

в) «Чалавек – чалавек» – 40%;

г) «Чалавек – знак» – 8%;

д) «Чалавек – мастацкі вобраз» – 37%.

*Удзельнікі абмяркоўваюць вынікі анкетавання, праведзенага групай «псіхолагаў».*

❑ **Паведамленні «Самыя незвычайныя прафесіі»**

**Вядучы.** Група «карэспандэнтаў» сабрала для вас інфармацыю аб прафесіях вельмі рэдкіх, так бы мовіць, незвычайных. Пазнаёмімся з вынікамі яе пошукаў.

Прадстаўнікі групы «карэспандэнтаў» па чарзе робяць кароткія паведамленні аб такіх незвычайных прафесіях, як суразмоўца, запіхвальнік у транспарт, распраміцель маршчын, выраўноўвальнік падушак, кавіст, нюхач, тэстар элітных ложкаў, тэстар водных труб для атракцыёнаў, тэстар элітных пляжаў, тэстар цукерак, тэстар камп'ютэрных гульняў і г.д.

❑ **Прэзентацыя «Шлях да поспеху»**

**Вядучы.** Скептыкі сцвярджаюць, што нельга дасягнуць сапраўдных вышынь у прафесіі, калі не маеш вялікага капіталу або патрэбных сувязей, калі ты нарадзіўся ў маленькім горадзе ці ў вёсцы. Зараз нашы вучні з групы «гісторыкаў» паспрабуюць даказаць, што гэта не так. Да вашай увагі – рэальныя гісторыі канкрэтных людзей, ураджэнцаў нашага горада, якія дабіліся сусветнага поспеху.

***Паведамленні «Сусветнавядомыя землякі»***

**Якуб Брэтцар** нарадзіўся 23 ліпеня 1690 г. у Пінску, славуты жывапісец, аўтар роспісаў касцёла езуітаў у Слуцку, капліцы ў Полацку, абразоў «Укрыжаванне», «Маці Божая» і інш.; **Рышард Капусцінскі** нарадзіўся 4 сакавіка 1932 г. у Пінску, пісьменнік; **Георгій Нядзведзь** нарадзіўся 21 сакавіка 1938 г. у Пінску, прафесар-неўрапатолаг, доктар медыцынскіх навук; **Ганна Бацюшка** нарадзілася 24 кастрычніка 1981 г. у Пінску, заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь.

**Вядучы.** Здараецца, шлях чалавека да справы свайго жыцця атрымліваецца досыць няпростым, нават мудрагелістым. Людзі, якія ўжо дасягнулі пэўнага прафесійнага поспеху і высокага матэрыяльнага дабрабыту, раптам кідаюць прыбытковую працу і пачынаюць займацца тым, да чаго ляжыць іх душа.

***Паведамленні «Гэтага не можа быць!»***

Вучні выступаюць з прэзентацыяй аб людзях, якія змянілі свае прафесіі і рэалізавалі сябе ў новай справе. Арганізуецца абмеркаванне паведамленняў членаў групы «гісторыкаў».

**III. Заключны этап. Рэфлексія**

❑ **Практыкаванне «Дарадца»**

Удзельнікі падзяляюцца на некалькі груп. Вядучы прапануе кожнаму запісаць прозвішчы ўсіх членаў сваёй групы, а насупраць указаць прафесію, якая, на яго думку, найбольш падыходзіць канкрэтнаму чалавеку. Пасля выканання задання ўдзельнікі выказваюць свае меркаванні.

**Вядучы.** Кажуць, чалавек не можа праверыць сваё прызванне, пакуль рукі яго не дакрануліся да самой справы. Прафесіяналізм развіваецца толькі ў працы. Таму шукайце сябе ў дзейнасці, удасканальвайце ўменні, не бойцеся спрабаваць і рызыкаваць. Упарта і засяроджана дабівайцеся поспеху, і ў вас абавязкова ўсё атрымаецца!

**❑ Рэфлексійнае практыкаванне «Тры – два – адзін»**

Вядучы прапануе ўдзельнікам запісаць тры галоўныя высновы, якія яны зрабілі на працягу сустрэчы, дзве справы, на якія яна натхніла, і адно пытанне, якое працягвае іх турбаваць. Арганізуецца абмеркаванне.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Климов, Е. А.** Психология профессионального самоопределения: учеб. пособие для студ. высших пед. учеб. заведений / Е. А. Климов. – М.: Академия, 2004. – 522 с.
2. **Петрановская, Л. В.** Мы готовим детей к позавчерашнему миру [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.pravmir.ru/lyudmila-petranovskaya-myi-gotovim-detey-k-pozavcherashnemu-miru/. – Дата доступа: 25.11.2020.


**Мадэльны ўрок на сайце часопіса www.n-asveta.by**

**Комарова Н. В.** Фразеологизмы. Употребление в речи (www.n-asveta.by/dadatki/madelny_urok/2022/n01/komarova.pdf)
**Лабачэўская С. У.** Народныя песні. Каляндарна-абрадавыя песні (www.n-asveta.by/dadatki/madelny_urok/2022/n01/labacheuskaya.pdf)
**Мишина Е. В.** Экологический урок «Западная Двина – река трех государств» (www.n-asveta.by/dadatki/madelny_urok/2022/n01/mishina.pdf)
**Прашкевич А. А.** Применение комикса на уроках французского языка (www.n-asveta.by/dadatki/madelny_urok/2022/n01/prashkevich.pdf)
**Савко И. О.** Употребление имен существительных в различных речевых ситуациях (www.n-asveta.by/dadatki/madelny_urok/2022/n01/savko.pdf)
**Стральчэня Н. А.** Ніл Гілевіч «Калі рана ўстанеш» (www.n-asveta.by/dadatki/madelny_urok/2022/n01/stralchenya.pdf)
**Шевчик И. Н.** Урок английского языка по теме «Англичане и их питомцы» (www.n-asveta.by/dadatki/madelny_urok/2022/n01/shevchik.pdf)
**Шпакоўская Р. У.** Раслінаводства. Геаграфія вырошчвання збожжавых культур (www.n-asveta.by/dadatki/madelny_urok/2022/n01/shpakouskaya.pdf)

***Каардынатар творчага праекта «Бацькоўскі сход» – Г. Б. Пшонік***


**Часопіс уключаны ў пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў.**

Падпісана да друку 13.01.2022. Папера афсетная. Фармат 60x84¹/₈. Гарнітура «Georgia». Друк афсетны.
Фіз. друк. арк. 12. Ум. друк. арк. 11,16. Ул.-выд. арк. 10. Тыраж 1790 экз. Зак. 36
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №709 ад 30.07.2010 (перарэгістрацыя 27.08.2019), выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77-110.
Афіцыйны сайт у інтэрнэце www.n-asveta.by, адрас электроннай пошты info@n-asveta.by
Тэлефоны: 215-05-20, 215-05-19, 215-05-18.
Установа «Выдавецкі дом «Педагагічная прэса» Рэдакцыя часопіса «Народная асвета».
Падпісныя індэксы: 74967 (інд.); 749672 (вед.)

Дзяржаўнае прадпрыемства «БудМедыяПраект» (ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014).
Вул. В. Харужай, 13/61, 220123, Мінск, Рэспубліка Беларусь.